# СПЕЦЫФІКА ЎПЛЫВУ ПАТРЫЯРХАЛЬНАЙ СТЭРЭАТЫПІЗАЦЫІ НА СТАНОВІШЧА МУЖЧЫНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ

*Дз. У. Сталяроў*

*малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі,*
*Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,*
*вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
nizshe@mail.ru

*Аннатацыя.* Мэта даследвання – абгрунтаваць уплыў патрыярхальна-маскулiннай стэрэатыпізацыі на павелічэнне рызыкі захворванняў, траўмаў і дэвіянтных паводзінаў сярод мужчын. У артыкуле даследуюцца спецыфічныя рысы ўплыву патрыярхальна-маскуліннага грамадства на якасць жыцця беларускіх мужчын. Суадносяцца паказчыкі распаўсюджаннасці дэвіантных паводзінаў сярод мужчынскага і жаночага насельніцтва. Робіцца аналіз колькасных дадзеных па асноўным характарыстыкам якасці жыцця мужчыны, а таксама яго уласнага стаўлення да свайго жыцця. Па выніках здзейсненага аналізу робіцца вывад аб небяспечным становішчы менавіта мужчын ва ўмовах патрыярхальнага грамадства. Акцэнтуецца ўвага на значнасці арганізацыі асветніцкіх мерапрыемстваў, прысвечаных папулярызацыі пазітыўных і разнастайных тыпаў мужнасцей у грамадстве.

*Ключавыя словы:* гендэр, маскуліннасць, стэрэатыпы, грамадства, патрыярхат, гендэрная роўнасць.

Існуе два супрацьлеглых увасаблення маскуліннасці – гегемонная і натуральная. Гегемонная маскуліннасць мае на ўвазе пад сабой стыль жыцця, які адпавядае мужчынскаму хабітусу лідэрства, улады, першынства. Гэта выяўляецца таксама ва ўключэнні ў маўленне і фіксацыю ў ім гендэрных стэрэатыпаў. Натуральная маскуліннасць ўвасабляе сабой жыццё, якое адпавядае мужчынскаму хабітусу, які прадугледжвае адмову ад розных абмежаванняў, якія ўласцівы для гегемоннай маскуліннасці. Пад гэтым разумеецца і права на эмацыйныя выразы сваёй асобы, і прызнанне за мужчынам права няўпэўненасці ў розных сітуацыях, турботы за будучыню, варыянтаў выбару іншых, адрозніваючыхся ад традыцыйнага, стасункаў з дзецьмі і іншымі сваякамі ў сям'і [9, с. 2].

Маральныя паняцці аб мужчынскім і жаночым гонары ў культуры патрыярхату вельмі розныя. Мужчынскі гонар заўсёды звязваўся з канкурэнцыяй і перавагай над іншымі; жаночы – са спакоем, цнатлівасцю і чысцінёй. Грамадства навязвае мужчыне думку пра тое, што ён не з'яўляецца нейкай першапачатковай самакаштоўнасцю, а абавязаны заслужыць права на павагу і прызнанне свайго гонару. Жаночы гонар першапачаткова лічыўся самакаштоўнасцю, і жанчыне нічога не трэба было даказваць і набываць, а толькі захоўваць наяўную рэпутацыю. Мужчынскі гонар заўсёды быў шчыльна звязаны са здольнасцю мужчыны навязаць сваю гульню і прымусіць іншых прызнаць яго перавагу. Такая сістэма паводзін заўсёды ў большай ці меншай ступені звязана з гвалтам. Акрамя таго, адмова ад

прызнання гэтых правіл заўсёды была для мужчыны спалучана з рызыкай страты рэпутацыі і павагі. У такім грамадстве сутнасць мужчыны адразу пазіцыяніравалася як актыўна-агрэсіўная, а жаночая сутнасць – як спакойная і дабрачынная. У мужчыне першапачаткова і адабралася і асуджалася агрэсіўная маскуліннасць, што ўскладняла сацыялізацыю [14, с. 188].

На працягу розных гістарычных перыядаў мужнасць падвяргалася трансфармацыям. Чым больш развітым было патрыярхальнае грамадства, тым больш жорсткім быў канцэпт ідэалу мужнасці. Калі ў XVIII ст. мужчына, якога лічылі годным дадзенага наймення яшчэ мог дазволіць сабе плакаць у чыёй-небудзь прысутнасці ці паскардзіцца на дрэннае самаадчуванне, то ў XIX ст. гэта ўжо магло каштаваць яму рэпутацыі сапраўднага мужчыны. У далейшым ідэалы мужнасці таксама змяняліся як у больш строгі, так і ў больш ліберальны бок. Такім чынам, пабудаванае аднойчы можна як разбурыць, так і аднавіць [1, с. 55].

Другая палова XIX – пачатак XX ст. характарызаваліся для ўсходнеславянскіх зямель змякчэннем аўтарытарнасці ў гендэрнай сферы. Гендэрны парадак трансфармаваўся пад уплывам грамадскіх змен. Улада мужчын паступова памяншалася, а сацыялізацыя хлопчыкаў і дзяўчынак станавілася ўсё менш кантраснай. Нягледзячы на гэта, патрыярхальна-аўтарытарная аснова гендэрных адносін сур'ёзна рэфармавана не была [4, с. 398].

Нават у пачатку XX ст. паміж функцыямі мужчыны і жанчыны ў грамадстве існавала прыкметная розніца. Нельга сказаць, што яна была на карысць першых. Мужчына традыцыйна лічыўся галоўным здабытчыкам і вымушаны быў працаваць па-за домам, а часам і па-за межамі роднага горада. Жанчына ж займалася пераважна хатнімі справамі. Важна адзначыць, што ў забяспечаных дамах прыслуга наймалася для выканання ўсіх відаў работ, таму жонкі і дочкі ў ажыццяўленні непасрэднай фізічнай або інтэлектуальнай дзейнасці па вядзенню гаспадаркі удзелу не прымалі [17, с. 96].

Максімум, што яны выконвалі – гэта функцыі кантролю за якасцю выканання работ. У сем'ях невысокага і сярэдняга даходу прыслуга наймалася толькі для пэўнага тыпу работы. Тым не менш, нельга гаварыць пра тое, што ў той перыяд на беларускіх землях практыкавалася падвоеная занятасць жанчыны або яе поўная занятасць у працэсе вядзення хатніх спраў. Па выніках перапісу насельніцтва 1897 г., занятасць жанчын аднаго з найбуйнейшых беларускіх гарадоў – Гомеля была больш чым у тры разы ніжэй мужчынскай (3524 супраць 11671) [17, с. 99].

Такое становішча спраў склалася ў выніку дамініравання кансерватыўнага ўспрымання гендэра, якое, з аднаго боку, зачыняла жанчын дома і не ўспрымала іх патэнцыял ўсур'ёз, з другога – ўскладала ўсю адказнасць за іх на мужчын. Гэта прыводзіла да істотнай асіметрыі ў паказчыках занятасці насельніцтва, што наносіла сур'ёзную шкоду як маральнаму боку жыцця, так і эканамічнаму.

Пэўныя ідэі эмансіпацыі жанчын выказваліся ў грамадстве, але праблема была ў тым, што далёка не ўсе жанчыны хацелі ўдзельнічаць у гэтым працэсе, роўна як і частка мужчын не жадала такога развіцця падзей [13, с. 29].

У цяперашні час актыўнай глабалізацыі становіцца зразумела, што шмат з таго, што прынята лічыць мужчынскімі паводзінамі ў рамках адной якой-небудзь культуры, не з'яўляецца нейкім агульным для ўсіх крытэрыем. Схіляючыся ў бок глабалізацыйнага грамадства, мы ўсё больш ясна разумеем, што ўяўленні аб маскуліннасці могуць сур'ёзна адрозніваца ў розных культурах і грамадствах [7, с. 30].

Праблемы становішча сучаснага беларускага мужчыны адлюстроўваюцца ў статыстыцы аб працягласці жыцця. Вельмі яскрава гэтае пытанне адлюстроўваюць лічбы ўзроўню сярэдняй працягласці жыцця і працягласці жыцця на пенсіі. Паводле афіцыйных дадзеных, працягласць жыцця мужчын з 2010 – 2017 гады была больш чым на 10 гадоў меншай за жаночую. Нягледзячы на такую розніцу, мужчыны выходзяць на пенсію пазней. З-за гэтага ў перыяд з 2013 па 2015 гады мужчыны жылі на пенсіі на 15,6 гадоў менш, а ў перыяд з 2010 па 2012 гады гэты паказчык вар'іраваўся ад 16 да 17 гадоў [5, с. 16].

Паэтапнае павышэнне пенсіённага ўзросту з 2017-га года да 63-х гадоў для мужчын і 58-мі гадоў для жанчын дрэнна адаб'ецца ў далейшым на працягласці і якасці ў першую чаргу мужчынскага жыцця.

Асноўныя захворванні ў большасці прысутнічаюць сярод мужчынскага насельніцтва. Гендэрныя суадносіны ў Беларусі на 2017 г. прадстаўлены па найбольш распаўсюджаным і цяжкім тыпам захворванняў, дзе яскрава паказана вялікая схільнасць да іх менавіта мужчынскага насельніцтва нашай краіны (Табл. 4) [6, с. 21].

*Табліца 4.* Гендэрная статыстыка ўзроўню смяротнасці на 100 тыс. чал.

| | Мужчыны | Жанчыны |
|---|---|---|
| Хваробы сістэмы кровазвароту | 718,1 | 679,9 |
| Злаякасныя новаўтварэнні | 245,8 | 149,3 |
| Цукровы дыябет | 2,6 | 2,4 |
| Хранічныя рэспіраторныя захворванні | 22,5 | 5,3 |

Як бачна, сярод мужчын з-за прычыны названых захворванняў назіраецца вялікая смяротнасць. Тым не менш, як міжнародныя, так і нацыянальныя арганізацыі аховы здароўя прытрымліваюцца зусім непрапарцыянальнага размеркавання ўвагі і сродкаў для забяспечвання ўзроўню жыцця мужчын і жанчын.

Акрамя таго, істотная частка работ як вытворчага, так і сельскагаспадарчага характару перакладзена на мужчын. Такая сітуацыя не лепшым чынам адбіваецца як на здароўі, так і на дэмаграфіі, паколькі правакуе гендэрны дысбаланс і павялічвае нагрузку на мужчынскае насельніцтва. Разам з гэтым, улічваючы сучасны ўзровень аўтаматызацыі, можна сказаць, што ў шматлікіх сферах гэткага тыпу гендэрная характарыстыка пры выкананні абавязкаў ужо не мае вырашальнай ролі [8, с. 499].

Самыя сур’ёзныя разыходжанні ў паказчыках смяротнасці сярод мужчынскага і жаночага насельніцтва выяўляюцца ў дзвух групах. У першую уваходзіць пераважна моладзь, а другую складаюць мужчыны ўзросту ад 60 гадоў. У большасці выпадкаў смерць юнакоў звязана з рознымі формамі гвалту, альбо з няшчаснымі выпадкамі. Сталыя мужчыны гінуць у большасці ў выніку хвароб сардэчна-сасудзістага і анкалагічнага характару [16, с. 18].

Можна зрабіць выснову аб тым, што такія дадзеныя шмат у чым абумоўлены патрыярхальнымі гендэрнымі стэрэатыпамі. Патрыярхальна-маскулінная культура патрабуе ад юнака актыўнасці і напорыстасці, што ў выніку і заканчваецца паводзінамі, якія спалучаюцца з рызыкай смерці ад гвалтоўных дзеянняў або ад няшчасных выпадкаў. Ад мужчыны ў такой культуры патрабуецца максімальная працаздольнасць і максімальны фінансавы поспех, што прадугледжвае неадэкватныя фізічныя і псіхалагічныя нагрузкі, якія ў наступным і прыводзяць да захворванняў і траўм.

Не варта думаць, што маскуліннасць – нейкая фундаментальная рыса беларускага грамадства. Так, напрыклад, калі звярнуцца да нацыянальнага фальклору, то ў беларускіх народных казках не так ужо і часта ў якасці галоўнага героя сустрэнеш брутальнага ваяра. Наогул, вырашэнне канфлікту пры дапамозе фізічнай сілы – далёка не самы папулярны фінал беларускіх казак у адрозненні, напрыклад, ад рускіх ці ўкраінскіх. У беларускіх сюжэтах заўсёды пераважала нейкая дыпламатычнасць, і, менавіта, гэта выходзіла на першы план пры вырашэнні канфліктных сітуацый. Разам з гэтым, тэма дыскрымінацыі мужчын зусім нярэдка сустракаецца ў сюжэтах беларускага фальклору, дзе вельмі часта мужчына знаходзіцца пад прыгнётам агрэсіўнай, сквапнай і хітрай жанчыны. Асабліва гэта выяўлялася ў бытавых казках, якія закранаюць сямейныя адносіны.

Біялагізатарскія погляды на функцыі мужчын і жанчын застаюцца асабліва трывалымі. Мужчынскія і жаночыя гендэрныя аб’яднанні нярэдка супрацьпастаўляюцца адзін аднаму. Стэрэатыпнае мысленне не дазваляе многім прыняць ідэю аб магчымасці існавання ўсіх тыпаў якасцей і ў мужчын, і ў жанчын. Недастатковая ўвага надаецца разгляду менавіта культурных паходжанняў адрознення жаноцкіх і мужчынскіх паводзін, а таксама самапрэзентацыі[2, с. 14].

У Беларусі мужчыны з-за фактараў знешняга характару паміраюць у чатыры разы часцей, чым жанчыны. Можна зрабіць вывад, што на мужчынскую смяротнасць у першую чаргу уплываюць не біялагічныя, а сацыяльныя прычыны [16, с. 18, 19].

Гэткая сітуацыя праследжваецца ўжо дастаткова даўно. Яшчэ ў 2011 г. смяротнасць мужчын і жанчын працаздольнага ўзросту складала 26634 для мужчын і 5806 – для жанчын. Адзначаная тэндэнцыя працягвалася і далей. Так у 2012 годзе лічба памерлых у працаздольным узросце мужчны склала больш за 80%. Суадносіны смыротнасці мужчынскага і жаночага працаздольнага насельніцтва у 2016 г. складалі 17516 да 3923, у 2017 – 17394 да 3807 [6, с. 54].

Статыстыка аб распаўсюджаннасці і выяўленні прафесійных захворванняў таксама паказвае значна большую схільнасць да іх мужчын (Табл. 7) [6, с. 71].

*Табліца 7.* Колькасць працаўнікоў з ўпершыню усталяваным прафесійным захворваннем (колькасць чалавек)

| Год | 2011 | 2014 | 2015 | 2016 | 2017 |
|---|---|---|---|---|---|
| Мужчыны | 89 | 68 | 72 | 67 | 66 |
| Жанчыны | 34 | 23 | 21 | 30 | 18 |

Такім чынам, у перспектыве з улікам істотнага разрыву ў працягласці жыцця і неабходнасці забеспячэння гендэрнай роўнасці найбольш рацыянальнай мерай было б адпаведнае рэфармаванне шэрагу палажэнняў, якія рэгулююць працоўныя адносіны і працэс выхаду на пенсію. У якасці такіх мер можна прапанаваць перагляд палітыкі працоўных ільгот і асаблівых умоў у рамках Працоўнага кодэксу, а таксама ураўноўванне пенсіённага ўзросту. Тым больш што пазітыўны прыклад гэткіх рашэнняў у свеце ўжо маецца. Так, у Арменіі мужчыны і жанчыны выходзяць на пенсію ва ўзросце 63 гады, у Венгрыі – у 62, у Канадзе – у 65, на Кіпры – у 65, у Іспаніі – у 65 [3, с. 33].

Дадзенае становішча рэчаў дэманструе небяспечную сацыяльную пазіцыю мужчынскага насельніцтва. Лічбы статыстыкі паказваюць больш нізкую у параўнанні з жанчынамі працягласць жыцця мужчын практычна па ўсім катэгорыям грамадзян і практычна па ўсіх катэгорыях прычын смерці. Гэта можа быць звязана як з недаглядам і недапрацоўкамі ў сацыяльна-адукацыйнай і культурнай сферах, так і з пытаннямі эканамічнага характару. Праблемнасць апошніх заключаецца не толькі ў справядлівым размеркаванні матэрыяльных рэсурсаў, але і ў адэкватным і рацыянальным размеркаванні вытворчых сіл і вызначэнні абавязкаў. Падцвярджаюцца прыведзеныя высновы і паказчыкамі суадносін мужчынскага і жаночага насельніцтва. Калі ва ўзросце ад 15 да 34 гадоў назіраецца некаторая перавага ў колькасці мужчынскага насельніцтва над жаночым, якое вар'іруецца ад 947 жанчын на 1000 мужчын да 972 жанчын на 1000 мужчын, то пачынаючы з узроставай катэгорыі 35-39 гадоў ужо адзначаюцца адваротныя суадносіны і на 1000 мужчын прыходзіцца 1008 жанчын. Ва ўзроставай катэгорыі 40-44 годы гэтыя суадносіны яшчэ больш павялічваюцца і дасягаюць 1058 жанчын на 1000 мужчын, катэгорыя 45-49 гадоў ужо характарызуецца паказчыкам суадносін 1104 на 1000 пры перавазе жанчын. Прамежак 50-54 дае суадносіны 1147 на 1000, прамежак 55-59 – 1212 на 1000, прамежак 60-64 – 1368 на 1000, ва ўзросце 70 і болей суадносіны 2469 жанчын на 1000 мужчын [15, с. 25–26].

Што датычыцца колькасці мужчын і жанчын на 2018 г., то логіка статыстычных паказчыкаў прыкладна падобная. Колькасць жанчын найбольш працаздольнага і фертыльнага ўзросту ў катэгорыі ад 15 да 39 гадоў складала адпаведна ад 220281 да 350574 чалавек. Колькасць жа мужчын у дадзеным узроставым прамежку была ад 232987 да 349879 чалавек. Толькі ў больш сталым

узросце назіраецца перавага жаночага насельніцтва. У моладзевай кагорце стабільна пераважалі і пераважаюць па колькасці мужчыны. Калі ж разглядаць нефертыльныя кагорты і кагорты ў якіх хутка зніжаецца фертыльнасць, працаздольнасць і грамадская актыўнасць ад 40 да 70 гадоў, то на 2018 г. жанчын у іх налічвалася ў залежнасці ад узросту ад 335305 да 653288 чалавек. У гэтым жа прамежку мужчыны складалі ад 318786 да 267163 чалавек [6, с. 34]. Як відаць з прыведзеных дадзеных, чым больш нефертыльная, не працаздольная і сацыяльна-пасіўная ўзроставая катэгорыя, тым больш істотны там гендэрны дысбаланс на карысць жаночага насельніцтва. Як ужо адзначалася, гэта можна растлумачыць больш высокай сацыяльнай і працоўнай нагрузкай на мужчын, абумоўленай патрыярхальна-маскуліннымі стэрэатыпамі, якія усё яшчэ актыўна функцыяніруюць у беларускім грамадстве. Дзеянне гэтых стэрэатыпаў праяўляецца ў павышанай працоўнай актыўнасці, што непазбежна адабіваецца на здароўі, а таксама ў розных іншых формах дэвіянтных паводзін, звязаных са злачыннасцю, шкоднымі звычкамі і ўвогуле з абыякавым стаўленнем да сябе з боку мужчын. Больш высокую долю мужчынскага насельніцтва ў плане наяўнасці шкодных звычак таксама падцвярджае статыстыка. У прыведзеных табліцах адлюстраваны дадзеныя аб распаўсюджаннасці алкагалізму сярод беларускага насельніцтва за апошнія гады (Табл. 5) [11, с. 112].

*Табліца 5.* Колькасць асоб, якія знаходзяцца на дыспансерным назіранні з прычыны залежнасці ад алкаголю

| Год | Усяго | Мужчыны (%) | Жанчыны (%) |
|---|---|---|---|
| 2010 | 179871 | 80,4 | 19,6 |
| 2011 | 178608 | 79,8 | 20,2 |
| 2012 | 176841 | 79,5 | 20,5 |
| 2013 | 174076 | 79,3 | 20,7 |

Аналізуючы прыведзеныя паказчыкі, можна адзначыць стабільна высокую алкагалізацыю насельніцтва з відавочнай перавагай мужчын. Зніжэнне паказчыка таксама назіраецца, але на дадзены момант яно мала ўплывае на агульнае становішча [11, с. 112].

Смяротнасць ад выпадковага атручвання алкаголем за 2011 год сярод мужчын склала 1511 чалавек, сярод жанчын – 280. У 2016 годзе дадзеная статыстыка паказала сярод мужчын 932, сярод жанчын – 143. У 2017 г. суадносіны былі такія: 934 мужчыны і 177 жанчын [6, с. 54].

Калі ж казаць пра штодзённае ўжыванне алкаголю, не звязанае з алкагалізмам як захворваннем, то вельмі цікавае даследаванне на гэтую тэму было праведзена ў 2011–2013 гг. сярод навучэнцаў розных адукацыйных устаноў. Гендэрныя адрозненні ў ім таксама паказалі значную перавагу юнакоў у плане ужывання алкагольных напояў. Напрыклад, штотыдзень ўжываюць алкаголь 10% юнакоў і толькі 4,7% дзяўчат. Матывы ўжывання, якія былі высветлены падчас прыведзенага

даследавання, таксама цікавыя. Яны ўключаюць у сябе такія тлумачэнні як: «забыцца пра непрыемнасці», «палепшыць настрой», «забяспечыць зносіны з асобамі супрацьлеглага полу». Даследаванне паказала, што ў свядомасці маладых людзей ўжыванне алкаголю атаясамляецца з самастойнасцю, прыгожым жыццём і прэстыжным становішчам. Менавіта гэтыя характарыстыкі з'яўляюцца аднымі з асноўных фактараў паспяховасці чалавека ў патрыярхальна-маскулінным грамадстве. Можна сказаць, што шмат у чым на ўжыванне алкаголю падштурхоўвае маладых людзей няўпэўненасць у сабе, адчуванне слабасці і дэпрэсіі, выкліканае разуменнем немагчымасці дасягнення традыцыйных ідэалаў маскуліннасці ў іх сацыяльна прымальнай форме [11, с. 127, 129].

З ужываннем тытуню сітуацыя прыкладна такая ж. Згодна з вынікамі прыведзенага даследавання сярод групы студэнтаў курылі 40,2% юнакоў і 26,2% дзяўчат. Як бачна, розніца ў гендэрных суадносінах складае 14%, што з'яўляецца досыць істотным паказчыкам [11, с. 131].

Разглядаючы насельніцтва Беларусі ў цэлым, ва ўсіх астатніх сацыяльных групах гендэрны перакос ва ўжыванні тытуню таксама вельмі адчувальны. Да прыкладу, на працягу 2010–2017 гг. колькасць мужчын, якія кураць у Беларусі, вар'іравалася ад 51,1 да 43,9%, колькасць жа жанчын змянялася ад 9,8 да 8,8%. Улічваючы, што асноўныя матывы ужывання тытунёвых вырабаў часцей за ўсё тлумачацца як «стрэс», «супакоіць нервы» і «расслабіцца», то можна сказаць, абапіраючыся на паказаны колькаснымі дадзенымі гендэрны дысбаланс, што беларускіх мужчын, якія жывуць ва ўмовах стрэсу значна больш, чым жанчын [ 15, с. 59].

Колькасць зарэгістраваных асоб, якія пакутуюць ад наркаманіі і таксікаманіі з упершыню ў жыцці ўстаноўленым дыягназам сярод мужчын і жанчын на працягу 2011–2017 гг. вар'іравалася ад 4–2,5 на 100 тыс. чал. сярод жанчын да 29,2–11,3 на 100 тыс. чал. сярод мужчын. У сувязі з гэтым можна прывесці прыклад і гендэрнай розніцы ў распаўсюджванні ВІЧ-інфекцыі. На працягу перыяду з 2011 па 2017 г. сярод жанчын гэты паказчык складаў ад 575 да 928 упершыню выяўленых выпадкаў, сярод мужчын ён быў ад 621 да 1540 [6, с. 69].

Мабыць, самым паказальным прыкладам негатыўнага ўплыву патрыярхальных стэрэатыпаў і маскулінная культуры на грамадства з'яўляецца суб'ектыўная характарыстыка мужчынамі і жанчынамі свайго здароўя (Табл. 6) [6, с. 80].

*Табліца 6.* Суб'ектыўная характарыстыка здароўя (%)

| Год / Адзнака | 2012 | 2015 | 2016 | 2017 | 2018 |
|---|---|---|---|---|---|
| Жанчыны | | | | | |
| Добрае | 26,8 | 23,4 | 23,9 | 23,9 | 24 |
| Станоўчае | 63,7 | 65,6 | 66 | 65,1 | 65,5 |
| Дрэннае | 9,5 | 11 | 10,1 | 11 | 10,5 |

| Мужчыны | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Добрае | 36,5 | 32,1 | 33,1 | 32,9 | 32,8 |
| Станоўчае | 57,5 | 59,4 | 59,3 | 59,6 | 59,6 |
| Дрэннае | 6 | 8,5 | 7,6 | 7,5 | 7,6 |

З паказаных дадзеных можна зрабіць выснову аб сур'ёзных супярэчнасцях і нестасоўках ў жыццёвай пазіцыі і самаацэнцы беларускіх мужчын. З аднаго боку, зыходзячы з лічбаў аб захворваннях і працягласці жыцця відаць, што якасць жыцця мужчын значна горш, што мужчыны значна часцей схільныя да захворванняў і смяротнасці ў працаздольным узросце. З іншага боку, паводле дадзеных прапанаванай табліцы відаць абсалютна некрытычнае стаўленне мужчын да свайго здароўя. Калі да характарыстыкі «станоўчае» яшчэ крыху больш імкнуцца жанчыны, (хоць разбежка з мужчынскімі адзнакамі не больш 5,5–6,7% у дадзеным часовым адрэзку), то да характарыстыкі «добрае», насуперак статыстычнай логіцы, імкнуцца мужчыны, і разбежка з жаночымі адзнакамі складае ад 8,7 да 9,7%. У той жа час як «дрэнным» сваё здароўе лічаць значна менш мужчын, чым жанчын. Разбежка паміж мужчынскімі і жаночымі адзнакамі – 2,5–3,5%. Варта сказаць, што і характарыстыка «станоўчае» ў жанчын ва ўзросце 60 гадоў і болей становіцца ніжэй, чым у мужчын (73,7% у мужчын супраць 71,4% у жанчын).

Такое стаўленне да жыцця ў грамадзян мужчынскага полу абгрунтоўваецца працяглым ўздзеяннем патрыярхальных стэрэатыпаў, якія патрабуюць ад мужчын не паказваць слабасці і праблемы, дэманстраваць сілу і паспяховасць. Так, можна прасачыць, як патрыярхат зжывае сам сябе, ствараючы ілюзорную ўладу мужчын, якой у рэчаіснасці валодае толькі невялікая іх частка, у той час як большасць толькі пакутуе фізічна і духоўна ад уласных няправільных адносін да сябе і жыцця.

*Заключэнне.* Нягледзячы на апісаныя складанасці, Беларусь ратыфікавала асобныя міжнародныя дакументы, якія датычацца забеспячэння гендэрнай роўнасці. У якасці прыкладаў можна прывесці і Канвенцыю ААН аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (1979), і платформу дзеянняў Сусветнай канферэнцыі па паляпшэнню становішча жанчын (Пекін, 1995 год) [10, с. 32].

Таксама ў 1998 г. Указам Прэзідэнта былі зацверджаны «Асноўныя напрамкі дзяржаўнай сямейнай палітыкі», дзе былі вызначаны мерапрыемствы, якія дазваляюць павысіць эканамічную самастойнасць сям'і і жанчын [16, с. 24].

Тым не менш, з-за трактоўкі дадзеных дакументаў толькі ў бок жанчын у Беларусі ўсё яшчэ неабходна распачаць і зацвердзіць, а можа нават і самастойна распрацаваць шэраг новых мерапрыемстваў і законаў, якія будуць вырашаць пытанні дыскрымінацыі мужчын, а таксама павялічаць гендэрную нейтральнасць асноўных сацыяльных сфер.

Такім чынам, можна сказаць аб неабходнасці асаблівай увагі да распрацоўкі праграм абароны мужчынскага здароўя і гарманічнага развіцця мужчынскай ідэнтычнасці. Гэта дасць магчымасць знізіць рызыкі дэвіянтных паводзін, якія

прыводзяць да пагаршэння здароўя, распаўсюджвання захворванняў і агульнага зніжэння якасці і бяспекі жыцця насельніцтва.

На падставе адзначаннага можна зрабіць наступныя высновы:

– патрыярхальна-маскулінныя стэрэатыпы сур'ёзна ўплываюць на зніжэнне якасці і працягласці жыцця беларускіх мужчын;

– у выніку ўздзеяння патрыярхальна-маскулінных стэрэатыпаў шмат сучасных мужчын не могуць адэкватна ацэньваць якасць свайго жыцця і паводзін;

– на базе дзяржаўных установ адукацыі і выхавання неабходна пачаць распрацоўкі праграм і мерапрыемстваў накіраваных на пераадоленне патрыярхальна-маскулінных стэрэатыпаў у грамадстве;

– у сучасных падыходах да заканадаўчай дзейнасці неабходна больш строга трымацца прынцыпаў гендэрнай роўнасці, рацыянальнасці і сацыяльнай справядлівасці.

Спіс літаратуры

1. *Бадентэр, Э.* Мужская сущность / Э. Бадентэр; пер. И. Крупичева, Е. Шевченко. – М.: АО "Изд-во «Новости»", 1995. – 304 с.

2. *Бем, С.* Линзы гендера: Трансформация взглядов на проблему неравенства полов / С. Бем; пер. с англ. Д. Викторовой. – М.: Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 2004. – 336 с.

3. *Василевич, Г.А.* Совершенствование статуса женщин в контексте защиты прав мужчин / Г.А. Василевич // Право и экономика: науч. практ. сб. законодательства с комментариями. – Вып. 7. – Минск: Право и экономика, 2017. – С. 31–36.

4. *Гончаров, Ю.М.* «Хозяин жизни»: купечество как тип мужественности / О муже(Н)ственности: сб. науч. ст.; под ред. С.А. Ушакина. – М.: Новое литературное обозрение, 2002. – 720 с.

5. Женщины и мужчины Республики Беларусь. Статистический сборник. – Минск, Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2016 / Редакционная коллегия: И.В. Медведева – Председатель редакционной коллегии И.С. Кангро, Ж.Н. Василевская, Е.И. Кухаревич, О.А. Довнар, Е.М. Палковская, А.И. Боричевский, И.И. Коношонок. – 2016. – 216 с.

6. Женщины и мужчины Республики Беларусь: статистический сборник / Ред. Колл.: И.С. Кангро, Ж.Н. Василевская и др. – Минск, 2018. – 167 с.

7. *Зальцман, М.* Новый мужчина: маркетинг глазами женщин / М. Зальцман, А. Мататия, Э. О'Райли. – СПб.: Питер, 2008. – 352 с.

8. *Злотников, А.Г.* Демографические процессы в деятельности потребительской коопреации Беларуси / А.Г. Злотников // Основные направления и формы развития потребительской кооперации в странах Европы и Азии: опыт, проблемы, перспективы: материалы междунар. науч.-практ. конф. в рамках ежегодных Чаяновских чтений, 17–18 ноября 2016 г. / Рос. ун-т кооперации. – М., 2016. – С. 498–502.

9. *Ильиных, С. А.* Шесть горизонтов пола: социологическая рефлексия маскулинности и фемининности / С. А. Ильиных [Электронный ресурс] // Научно-методический электронный журнал «Концепт». – 2013. – Т. 3. – С. 106–110. – Режим доступа: https://e-koncept.ru/2013/53023.htm – Дата доступа: 18.04.20.

10. Ликвидировать разрыв в течении жизни одного поколения: ВОЗ комиссия по социальным детерминантам здоровья от 2008 г. / Заключительный доклад.; пер. Л. Головина, С. Евтушенко – Казань: «Весь мир»,– 2008. – 246 с.

11. Молодежь в зоне риска: социально-культурные основы профилактики пьянства и алкоголизма; под. ред. О.А. Павловской; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т философии. – Минск: Бел. навука, 2015. – 429 с.

12. *Онуприенко, С.П.* Экологическая культура в сознании детей и взрослых Беларуси: грани становления / С.П. Онуприенко. – Минск: Экоперспектива, 2015. – 212 с.

13. *Рихтер, К.* Освобождение без угнетателя? О понятии эмансипация в Литве и Беларуси в конце XIX столетия / Женщины в политике: новые подходы к политическому. Феминистский образовательный альманах. – Вып. 2. Личное как политическое; под ред. А.Ю Першай, Е.М. Иванова. – Прага: Адліга, 2013. – 152 с.

14. *Робинсон, П.* Невольники чести: мужественность на поле боя в начале XX века / О муже(Н)ственности: сб. науч. ст.; под ред. С.А. Ушакина. — М.: Новое литературное обозрение, 2002. – 720 с.

15. Семья в Республике Беларусь: стат. сб.; ред. кол.: И.В. Медведева, И.С. Кангро [и др.]. – Минск, 2017. – 114 с.

16. *Сидорская, И. В.* Гендер и СМИ: учеб. пособие./ И.В. Сидорская, А. Раду. – Минск: РИВШ, 2014. – 134 с.

17. *Ященко, О.* Заметки к этнографии городской жизни: повседневность гомельчанок в начале XX века // Женщины на краю Европы: сб. науч. ст.; под ред. Е.И. Гаповой. – Минск: ЕГУ, 2003. – 436 с.

# SPECIFICITY OF THE IMPACT OF PATRIARCHAL STEREOTYPISATION ON THE STATE OF THE MALE POPULATION OF BELARUS

*D.V. Stolyarov*

*Junior Researcher at the Institute of Philosophy,*
*National Academy of Sciences of Belarus,*
*Surganova str., 1, bldg. 2, 220072, Minsk, Republic of Belarus*
nizshe@mail.ru

*Abstract.* The aim of the study is to prove that patriarchal stereotypes negatively affect the lives of men. The article examines the features of the influence of patriarchal stereotypisation on the state of Belarusian men. The level of prevalence of deviant behavior among men and women is investigated. Analyzed are statistical data that show the standard of living of the male population. The attitude of men to their health is being investigated. It studies how patriarchal stereotypes affect the quality of life. The conclusion is made about the unfavorable position of men in the modern patriarchal society of Belarus. It is necessary to organize educational events dedicated to the peculiarities of the socialization of men. In society, it is necessary to implement not one, but many strategies of male behavior.

*Keywords:* gender, masculinity, stereotypes, society, patriarchy, gender equality.